Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | | |
| **Продавец** | **ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Братьев Лизюковых, 1** | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| **Наименование** | **Общая площадь** | **Этаж** | **Инвентарный номер** | **Число комнат** |
| **Квартира** | 66,5 кв.м | 4 | 340/D-219285 | 2 |
| **Адрес** | Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Карла Маркса, 25-16 | | | |
| Квартира расположена в пятиэтажном жилом доме 2010 г.п. из силикатного камня и состоит из двух жилых комнат, кухни, коридора, ванной туалета, балкона. Общая площадь жилого помещения – 66,5 кв.м, жилая площадь – 40,1 кв.м | | | | |
| **Начальная цена – 78 065 рублей 52 копейки (780 655 200 бел. руб.)** | | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **12.08.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **10.08.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | | | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.**

**Продавец: ОАО «Витрембыт», 210035, г. Витебск, ул. Терешковой, 3, тел.(0212)48-79-82**

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №240/D-42005 по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Черняховского, 7А-1, площадью 327,1 кв.м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, в т.ч. места общего пользования: котельная, коридор, тамбур, административное помещение с асфальтобетонным покрытием, воротами металлическими, забором металлическим, водопроводной сетью, кабельной линией, канализационной сетью, наружной газовой сетью. **Нач. цена** (с учетом/до деноминации): 140187,94/1 401 879 400 бел. руб. с НДС. **Задаток** (с учетом/до деноминации): 14018,70/140 187 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. №240/С-37346 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Черняховского, 7а, площадью 233,3 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование – здание склада. **Нач. цена** (с учетом/до деноминации): 12422,21/124 222 100 бел. руб. с НДС**. Задаток** (с учетом/до деноминации): 1242,20/12 422 000 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **27.07.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: **с 12.07.2016 с 8.30 по 26.07.2016 до 17.00.** Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Покупателю по его письменному заявлению может предоставляться рассрочка оплаты на срок до 9 месяцев. Имущество расположено на зем.участке с кадастровым №242400000004001353 площадью 0,4181 га под производственную базу. Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 05.01.2016.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр.лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона производится в сроки, указанные в договоре купли-продажи. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информация по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

Утерянную идентификационную карточку риэлтера №АВ0012511 срок действия до 14.11.2019 года на имя ШИМКО Александра Григорьевича Частное риэлтерское унитарное предприятие «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс» **считать недействительной.**

# У КРАІНЕ СЯМІ ТЫСЯЧ АСТРАВОЎ




## Што адбываецца на Філіпінах?

**Прыведзены да прысягі новы прэзідэнт Філіпін Радрыга Дутэртэ. 71-гадовы юрыст шырока вядомым стаў у якасці мэра горада Даваа на востраве Мінданаа (дарэчы, аднаго з найбуйнейшых мегаполісаў у краіне). Гэтую пасаду ён займаў амаль чвэрць стагоддзя — 22 гады. Палітык праславіўся дзякуючы сваім «нефармальным» метадам барацьбы са злачыннасцю. У прыватнасці, Дутэртэ часцяком заклікаў да пазасудовых распраў з бандамі рабаўнікоў і наркагандляроў.**

**7107 астравоў Філіпін фарміруюць другі па велічыні (пасля Інданезіі) архіпелаг на планеце. Яго працягласць з поўначы на поўдзень складае каля 2000 кіламетраў, а з захаду на ўсход — 900 км. Уяўляеце сабе тэрыторыю? Між тым гэта адна з краін, якая цяпер развіваецца найбольш хуткімі тэмпамі ў свеце. Якім чынам філіпінцам удалося здзейсніць амаль немагчымае і што за перспектывы ў астраўной дзяржавы?**



### ПАМІЖ ІСПАНІЯЙ І ЗША

Крыху лічбаў для самага агульнага ўяўлення. Філіпінскія астравы — частка Малайскага архіпелага. Даўжыня берагавой лініі перавышае 36,3 тыс. км. Агульная плошча астравоў — 299,7 тыс. $км^2$. Рэльеф складаюць галоўным чынам горы, самы высокі пункт — вулкан Апа (2954 метры над узроўнем мора). Горныя хрыбты маюць вулканічнае паходжанне, паколькі архіпелаг знаходзіцца на стыку мацерыковай і акіянічнай літасферных пліт і ўваходзіць у так званае Ціхаакіянскае вогненнае кольца, якое вылучаецца павышанай сейсмічнасцю. Глыбакаводныя жолабы і вулканічныя астравы — насамрэч адметная рыса Філіпін. Каля ўзбярэжжа вострава Мінданаа праходзіць Філіпінскі жолаб глыбінёй звыш 10 км(!) — адзін з найглыбейшых у сусветным акіяне.

Першыя людзі, як мяркуюць даследчыкі, прыйшлі на Філіпіны па сухапутных прыродных «мастах», якія калісьці звязвалі будучы архіпелаг з Тайванем і Барнэа, у познім плейстацэне (каля 200.000 да н.э.). Знойдзены стаянкі, якія адносяцца да 50 тысячагоддзя да н.э. Пачынаючы з V стагоддзя, на тэрыторыі сучасных Філіпін сфарміравалася цывілізацыя, заснаваная на змешванні розных культур і народнасцяў.

**Паводле прагнозу МВФ, да 2020 года валавы ўнутраны прадукт Філіпін павялічыцца да $ 510 млрд. Чакаецца, што гэта будуць самыя высокія тэмпы развіцця сярод усіх буйных эканомік Усходняй і Паўднёвай Азіі.**

У 1521 годзе тут высаджваецца іспанская экспедыцыя на чале з Фернанам Магеланам. З 1543-га астравы пачалі звацца Філіпінамі ў гонар іспанскага прынца, а пазней караля Філіпа ІІ. Тэрыторыя падпарадкоўвалася віцэ-каралю Новай Іспаніі. Шырокае распаўсюджанне атрымалі іспанская мова і каталіцызм, за выключэннем паўднёвых мяцежных астравоў, населеных мусульманамі. У 1898 годзе, пасля Іспанска-амерыканскай вайны, Іспанія перадала Філіпіны, Кубу, Гуам і Пуэрта-Рыка Злучаным Штатам Амерыкі за 20 мільёнаў долараў у адпаведнасці з Парыжскім мірным дагаворам.

Падчас Другой сусветнай вайны Філіпіны былі акупаваны японцамі. Фактычна толькі 4 ліпеня 1946 года была абвешчана незалежнасць краіны. У знешняй палітыцы Філіпіны традыцыйна арыентаваліся на ЗША, з якімі ў 1952-м быў заключаны ваенны дагавор. Але з 1980-х улады краіны імкнуліся прытрымлівацца больш незалежнага курсу ў міжнародных справах і дыверсіфікаваць двухбаковыя сувязі ў рэгіёне. Краіна — член ААН і яе спецыялізаваных арганізацый, а таксама міжнародных рэгіянальных аб'яднанняў і органаў, сярод якіх АСЕАН, Азіяцкі банк, Азіяцка-Ціхаакіянская эканамічная канферэнцыя.

### ПУНКТЫ РОСТУ

Гаспадарка краіны, цалкам разбураная вайной, было адноўлена да 1951—1953 гадоў. Тэмп прыросту нацыянальнага прадукту ў 1949—1953 гг. быў вельмі высокім — у сярэднім па 13,3% за год, затым пастунова знізіўся да 4,6% у 1960—1965 гг. У канцы XX стагоддзя Філіпіны перажывалі эканамічны рост, звязаны перш за ўсё з развіццём інфармацыйных тэхналогій і наяўнасцю таннай працоўнай сілы. Дзякуючы развіццю сектара паслуг, павелічэнню прамысловай вытворчасці і заахвочванню экспарту, ВУП вырас на 4,4% у 2002-м і на 4,5% у 2003-м. Сур'ёзнымі праблемамі для філіпінскай эканомікі застаюцца нераўнамернае размеркаванне даходаў, высокі ўзровень беднасці (у 2001-м каля 40% насельніцтва жыло ніжэй за рысу беднасці) і буйная запазычанасць (аб'ём дзяржаўнага доўгу дасягаў 77% ВУП). У 2003-м ВУП складаў, па ацэнцы, 390,7 млрд долараў — $4600 на душу насельніцтва.

Рэзкае павелічэнне долі прадукцыі апрацоўчай прамысловасці ў экспарце — з менш чым 10% у 1970-м да 75% у 1993-м — зрабіла гэтую галіну гаспадаркі галоўнай крыніцай валютных даходаў Філіпін. Асабліва важнае месца ў вывазе занялі электроннае абсталяванне і адзенне. Філіпіны ўваходзяць у дзясятку найбуйнейшых сусветных вытворцаў хрому. З рудных мінералаў сустракаюцца золата, медзь, нікель, жалеза, свінец, марганец, серабро, цынк і кобальт. Запасы нафты былі выяўлены ля ўзбярэжжа вострава Палаван.

Філіпіны актыўна імкнуцца да самазабеспячэння электраэнергіяй. Гарачая пара з нетраў зямлі ўпершыню была выкарыстана ў якасці крыніцы энергіі ў 1980-м, а цяпер краіна займае другое месца ў свеце пасля ЗША па маштабе развіцця геатэрмальнай электраэнергетыкі. У 1996-м 63% электраэнергіі было выраблена цеплавымі станцыямі (у тым ліку 42% працуюць на вадкім паліве), 15% — ГЭС і 23% — геатэрмальнымі станцыямі.

### СЛОВА І СПРАВА

Паводле прагнозу МВФ, да 2020 года валавы ўнутраны прадукт Філіпін павялічыцца да $510 млрд. Чакаецца, што гэта будуць самыя высокія тэмпы развіцця сярод усіх буйных эканомік Усходняй і Паўднёвай Азіі. У выніку да канца гэтага дзесяцігоддзя Філіпіны па аб'ёме ВУП абгоняць Сінгапур і Тайланд і амаль зраўняюцца з Малайзіяй. Прагнозы на больш аддаленую перспектыву — да 2050 года — малююць перад гэтай астраўной краінай яшчэ больш глабальныя перспектывы.

У 2014 годзе, паводле звестак нацыянальнай статслужбы PSA, на долю сельскай гаспадаркі прыпала толькі 11,3% філіпінскага ВУП, на долю прамысловасці — 31,4%, а 57,3% забяспечыла сфера паслуг. У прамысловасці заўважную ролю адыграюць суднабудаванне (Філіпіны ў гэтай галіне займаюць чацвёртае месца ў свеце пасля Кітая, Паўднёвай Карэі і Японіі), вытворчасць электронікі і іншых высокатэхналагічных кампанентаў.

Палітычная сітуацыя ў краіне стабільная і спакойная. Адсутнасць пагрозы тэрактаў і войнаў спрыяе развіццю турызму на Філіпінах. Выбар філіпінцаў абумоўлены не настальгіяй па аўтарытарызме, а хутчэй абурэннем у адрас эліты. Дарэчы, такая тэндэнцыя цяпер назіраецца па ўсім свеце. Філіпінская палітыка заўсёды была больш зарыентавана на асобу, чым на стратэгіі. Дутэртэ апеляваў да тых праблем, якія ўяўляліся большасці філіпінцаў найбольш істотнымі (высокі ўзровень злачыннасці, эканамічныя праблемы, карупцыя). Акрамя таго, ён аўтсайдар адносна таго закрытага кола эліты, з якога пераважна фарміравалася філіпінская ўлада, і гэта толькі дабавіла яму прывабнасці ў вачах выбаршчыкаў.

За Дутэртэ, якога падтрымалі левыя партыі, аддалі галасы больш як 16,5 мільёна філіпінцаў — 39 працэнтаў выбаршчыкаў паверылі ў яго абяцанні пакончыць са злачыннасцю і наркагандлем у краіне за паўгода. Дутэртэ заяўляў, што будзе дабівацца ад парламента аднаўлення смяротнага пакарання праз павешанне, адмененага ў краіне ў 2006 годзе, забараніць гандаль алкаголем і тытунём і ўвядзе каменданцкі час для дзяцей.

У Радрыга Дутэртэ словы са справай не разыходзяцца. Дастаткова прывесці адзін прыклад. Летась нейкі турыст у адной з кавярняў Даваа адмовіўся патушыць цыгарэту, парушаючы тым самым гарадскі антытытунёвы закон. Уладальнік установы патэлефанаваў мэру. Дутэртэ асабіста прыбыў у бар і прымусіў турыста... з'есці недакурак. Мяркуючы па гэтым эпізодзе, цяперашні філіпінскі прэзідэнт насамрэч добра ведае, як трэба рабіць. І што б ні казалі, факт застаецца фактам: пры Дутэртэ ўзровень злачыннасці ў Даваа рэзка знізіўся, а ўзровень жыцця павысіўся. Паглядзім, ці атрымаецца ў яго так зрабіць у маштабе 7107 астравоў.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*